# ХТО АДКАЖА ЗА ЛЁС ГЕЛІЯДОРА?

## Валанцёры не аддалі ката гаспадыні. Яна падала на іх у суд...

**Гэта судовая справа насамрэч незвычайная, хаця выглядае банальнай. Фабула нескладаная. Ката, якога адлавілі работнікі спецгаспадаркі, валанцёры аддалі іншай асобе. Між тым былая гаспадыня пазнала свайго ката на сайце дабрачыннага таварыства. Перагаворы з валанцёрамі не прынеслі спрыяльных для яе вынікаў. Каб вярнуць свайго выхаванца, жанчына звярнулася ў суд.**

Суд аб выпатрабаванні сваёй маёмасці з чужога незаконнага валодання праходзіў з удзелам двух бакоў. З аднаго — былая гаспадыня Алена, з другога — прадстаўнікі дабрачыннага таварыства «Выратуй жыццё». Менавіта яны — тры жанчыны-валанцёры — выступілі адказчыкамі ў гэтай справе. Падчас працэсу ісціца Алена расказала аб сваім выхаванцы, а таксама паведаміла, пры якіх абставінах ён знік.

Па словах жанчыны, тры гады таму яна падабрала на вуліцы рыжага ката, які атрымаў мянушку Тарнада. Паколькі кот не быў кастрыраваны, ён часта выходзіў гуляць на вуліцу, мог не прыходзіць некалькі дзён, але потым зноў вяртаўся. Так было да сакавіка гэтага года. Падчас чарговай прагулкі з сынам гаспадыні кот уцёк. Вядома, біць трывогу ніхто не спяшаўся, бо такія выпадкі былі і раней. Але тэрмін знікнення зацягнуўся, і гаспадыня занепакоілася. Пачала шукаць яго на сайтах, а потым звярнулася ў пункт адлову безнаглядных жывёл пры спецаўтагаспадарцы.

— У дыспетчарскай мне сказалі, што ўсе каты, якія адлоўлены, будуць знаходзіцца на сайце «Выратуй жыццё». Я зайшла на гэты сайт і сапраўды ўбачыла свайго ката. Я яго пазнала, як і кожны ўладальнік жывёлы пазнае свайго выхаванца. Я зразумела, што гэта мой кот, — паведаміла на судзе Алена.

Праўда, цяпер кот зваўся Геліядор. Па словах ісціцы, быў аб'яўлены збор сродкаў на яго лячэнне. Алена ўвайшла ў перапіску з адміністрацыяй сайта з просьбай вярнуць ёй ката. Але неўзабаве атрымала такую СМС: «Вы вінаватыя ў тым, што згубілі ката, вінаватыя ў тым, што кот быў на мяжы жыцця і смерці, і вы смееце яшчэ пісаць усім, хто дапамагае яго выратаваць? Можа, нам варта пісаць заяву у міліцыю? Будзеце аплачваць лячэнне ката, які ваш, паводле вашага меркавання? Гатовыя заплаціць 200 рублёў за тое, што вы нядбайны гаспадар?»

Аднак на судзе валанцёры заявілі, што не ведаюць пра лёс ката, якога шукае Алена. І ўвогуле яна павінна даказаць, што той рыжы кот, які быў на сайце, менавіта яе выхаванец. Бо ніякіх жэтонаў на ім не было. Пры гэтым дзеянні саміх валанцёраў выклікалі пытанні ў суддзі. Напрыклад, чаму яны адмовілі жанчыне паглядзець на ката, які трапіў у адлоў і якому шукаюць гаспадара? Чаму не здымаецца аб'ява, калі ката няма? І чаму праз некалькі дзён на сайце з'яўляецца збор сродкаў на лячэнне гэтага ката? На гэтыя пытанні валанцёры чамусьці не змаглі даць дакладны адказ. Патлумачылі няўзгодненай дзейнасцю членаў таварыства. Магчыма, здымак ката размясціў дзяжурны валанцёр, якога зараз вызначыць складана.

У перапынку судовага пасяджэння я пацікавілася, хто працуе ў дабрачынным таварыстве і колькі адлоўленых жывёл яны аддалі новым гаспадарам. Па словах старшыні таварыства «Выратуй жыццё» Анастасіі, валанцёры — гэта людзі, якія дапамагаюць у свой вольны час, бясплатна. Яны супрацоўнічаюць са спецаўтагаспадаркай, дзе ёсць пункт адлову безнаглядных жывёл. Як правіла, з аднаго адлову прывозяць 3-5 асобін.

— Гэта не прытулак, і жывёл не могуць там трымаць, мы шукаем кампраміс паміж магчымасцю дзяржаўнай установы і жыццём гэтых істот. Часу на пошук новых гаспадароў адводзіцца зусім мала — усяго пяць сутак. А ў тых, што прыносяць самі гаспадары, наогул няма шанцаў, — расказала Анастасія.

Яна таксама прыгадала некалькі выпадкаў паспяховага выніку іх дзейнасці, калі жывёлам з адлову былі знойдзены новыя гаспадары. Праўда, дакладнай лічбы назваць не змагла, такога ўліку таварыства не вядзе.

Вядома, не магла не пацікавіцца і сітуацыяй, якая стала падставай для судовай справы. Няўжо нельга было аддаць ката гэтай жынчыне? У валанцёраў свае аргументы. Яны лічаць, што гаспадыня нядбайная, кот амаль не быў дома, хіба толькі прыходзіў спаць. Маўляў, яна і сама сказала, што стала шукаць ката толькі праз два тыдні. Прытым яны не ўпэўнены, што гэта менавіта яе кот. Бо ў іх практыцы быў выпадак, калі ў ката аб'явіліся некалькі гаспадароў ужо пасля таго, як яму знайшлі новы дом. Праўда, там да суда справа не дайшла, змаглі гэты працэс урэгуляваць. Яшчэ быў выпадак, калі дзяўчына прынесла ў пункт адлову кошку, якую быццам падабрала на вуліцы, а на самай справе гаспадары папрасілі прыглядзець за ёй падчас ад'езду. Добра, што яны своечасова прыйшлі па яе.

— У многіх валанцёраў таварыства свая трагічная гісторыя, звязаная з жывёламі. Таму з'явілася ўнутраная патрэба дапамагаць. Прыходзіць нямала людзей, у тым ліку студэнты, але далёка

не ўсе могуць вытрымаць. Добра, калі яны затрымаюцца на некалькі дзён. Магчыма, валанцёрскі рух быў бы больш актыўны, калі б улады таксама не стаялі ўбаку ад праблемы безнаглядных жывёл. Вядома, зрабіць ін'екцыю прасцей за ўсё, але варта шукаць больш гуманныя шляхі, — лічыць Анастасія.

Валанцёры не ўтойваюць, што ўмовы ўтрымання жывёл у пункце адлову далёкія ад нармальных. Таму яны найперш імкнуцца размясціць на сайце здымкі тых жывёл, якія трапляюць сюды. Работнікі спецгаспадаркі таксама не застаюцца ўбаку, тэлефануюць валанцёрам пасля чарговага адлову, каб тыя забіралі жывёл. Перадаюць іх проста ў мяшках. Такім чынам трапіў да іх і рыжы кот, які пазней атрымаў мянушку Геліядор. Пад гэтым імем ён з'явіўся на сайце, а потым і ў новай гаспадыні.

— На нашу думку, былая гаспадыня парушыла правілы ўтрымання хатніх жывёл, кот не зарэгістраваны, хоць жыў у яе амаль чатыры гады. Таму лічым, што ісціцу саму трэба прыцягнуць да адказнасці, — заявілі на судзе прадстаўнікі дабрачыннага таварыства.

Алена, у сваю чаргу, наракала на валанцёраў, якія адмовілі аддаць ёй ката. Незразумелым, на яе погляд, з'яўляецца і збор сродкаў на лячэнне ката, якога ў іх, відаць, ужо не было. Як стала вядома падчас судовага разбору, у ветэрынарную клініку звярталася новая гаспадыня Геліядора.

Што датычыцца спрэчак наконт таго, «той гэта кот ці не», было праведзена даследаванне фотаздымкаў ката падчас яго знаходжання ў Алены і на сайце пасля адлову. Спецыялісты кафедры анатоміі жывёл Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта пацвердзілі, што гэта той самы кот у розныя перыяды яго жыцця. На гэтым можна было б і завяршыць наш артыкул пра незвычайную судовую справу. Бо вынікам стала адмова суда ў іску да адказчыкаў — факт знаходжання ката ў валанцёраў не быў даказаны. Акрамя таго, у ісціцы не ўзнікла права ўласнасці на жывёлу. Аб тым, што гэта за права, крыху пазней. А зараз — даволі сумны працяг.

Сапраўды, у адлоўленага з вуліцы ката знайшлася новая гаспадыня. Ёю стала студэнтка гродзенскай ВНУ, якая ўбачыла на сайце аб'яву пра ката Геліядора і забрала яго да сябе. Яна адразу павезла ката ў клініку, дзе ў яго выявілі шэраг захворванняў, у тым ліку цыстыт, а таксама абламаныя іклы. Урач сказаў, што гэта ад умоў утрымання, магчыма, жывёла знаходзілася дзесьці ў зачыненым памяшканні. Было прызначана лячэнне, і кот быццам пайшоў на папраўку, але аднойчы раптоўна пачаліся сутаргі, і ён загінуў. Пражыў у новай гаспадыні дзесьці месяцы тры.

Дык хто насамрэч вінаваты ў нешчаслівым лёсе рыжага ката Геліядора? Нядбайная гаспадыня, якая не звяртала асаблівай увагі, дзе прападае яе выхаванец па некалькі дзён? А можа, валанцёры, якія чамусьці адмовілі жанчыне, якая яго шукала? Ці служба адлова, дзе жывёлы ўтрымліваюцца ў неспрыяльных умовах?

У першую чаргу суд даў прававую ацэнку гаспадыні ката. Як аказалася, ёю парушана заканадаўства аб утрыманні хатніх жывёл.

— Калі знаходзіш безнаглядную жывёлу, як было з гаспадыняй ката, трэба звярнуцца альбо ў міліцыю, альбо ў ЖЭС ці ў органы мясцовага самакіравання і паведаміць аб гэтым. І калі праз паўгода ніхто не заявіў аб праве ўласнасці, такое права набывае новы гаспадар. Пры гэтым жывёлу неабходна зарэгістраваць. Дадзеная працэдура не патрабуе ад уладальнікаў ніякіх страт, трэба проста прыйсці ў ЖЭС і там атрымаць жэтон. Пасля таго ніякіх праверак, ніякіх падаткаў на жывёлу не будзе, — патлумачыла суддзя Ксенія Стасюкевіч. — Гэта не ўсе ведаюць, людзі бяруць безнагляднага ката ці сабаку і лічаць, што робяць добрую справу, а такія моманты не ўлічваюць, і тады даказаць сваё права на жывёлу вельмі складана. Вось і ў дадзеным выпадку нельга сказаць, што Алена валодала катом законна. А суд можа вярнуць жывёлу, якая з'яўляецца асаблівым відам маёмасці, толькі таму, хто мае на яе законнае права.

Ёсць у суда заўвагі і да дзейнасці валанцёраў, якія ўзялі на сябе функцыю вызначыць, хто дбайны, а хто нядбайны гаспадар. Зноў жа, адсутнічае кантроль за зборам сродкаў. Варта было б павярнуць гэтую дзейнасць у законнае рэчышча, бо ахвотных дапамагчы нямала. Разам з тым валанцёрская дзейнасць — амаль што адзіны шанц для такіх жывёл.

Гэты прэцэдэнт, лічыць Ксенія Стасюкевіч, дае падставу для ўдасканальвання заканадаўства. У краіне ёсць правіла ўтрымання жывел хатніх і безнаглядных, зацверджаныя пастановай Савета Міністраў, ёсць іншыя акты. На жаль, яны не зусім гуманныя. Згодна з існуючымі правіламі, жывёла без жэтона ў пункце адлова павінна быць падвергнута эўтаназіі на працягу сутак, з жэтонам — на працягу пяці сутак. Дарэчы, Гродзенскім гарвыканкамам прынята рашэнне ўраўняць у правах жывёл з жэтонамі і без — і першыя, і другія маюць шанц да выратавання на пяць сутак. Але і гэта не выйсце. Праблему, лічыць Ксенія Стасюкевіч. трэба разглядаць больш пільна, знаходзіць сродкі для ўтрымання гэтых жывел, ствараць умовы ў часовых прытулках і прапагандаваць іх стэрылізацыю. Дарэчы, валанцёрскае таварыства звярталася да гарадскіх улад з прапановай стварыць прытулак пры таварыстве, але пытанне заглухла на стадыі звароту, бо не атрымала падтрымкі.

Кот Геліядор не проста аказаўся ў ланцужку неспрыяльных падзей. Яго трагічны лёс — не выпадковая з'ява, а, хутчэй, безадказнасць грамадства перад нашымі меншымі братамі. Здаецца, усе нядрэнныя людзі, усе імкнуліся дапамагчы кату, а ў выніку атрымалася даволі сумная гісторыя. Прыгожы быў кот Геліядор. І загінуў. А мне гэты рыжы кот нагадаў суседскага ката Філю, таксама рыжага, які таксама вельмі часта ходзіць гуляць на вуліцу. Яго флегматычны выгляд прымушае жыхароў пад'езда адчыняць яму дзверы. І наўрад ці каму прыйдзе ў галаву зрабіць гэтаму кату шкоду. Але гэта, напэўна, зусім іншая гісторыя.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**